## Удасканальваецца заканадаўства па пенсійным забеспячэнні

**Адпаведны ўказ №452 падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакумент павінен прывесці раней прынятыя рашэнні кіраўніка дзяржавы ў адпаведнасць з указам №137 ад 11 красавіка 2016 года «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння». Для гэтага прадугледжваецца іх карэкціроўка ў частцы ўдакладнення ўзросту, які з'яўляецца адным з крытэрыяў вызначэння працаздольнасці грамадзян пры назначэнні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў выглядзе штомесячнай дапамогі, а таксама дае права на льготны праезд пенсіянерам на перыяд сезонных сельскагаспадарчых работ штогод з 1 мая па 30 верасня.

Акрамя таго, удакладняецца ўзрост, у залежнасці ад якога прымаюцца рашэнні аб пастаноўцы на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў і аб праве на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання, і ў адпаведнасці з якім вызначаецца тэрмін дзеяння кантракта, што заключаецца (падаўжаецца) з работнікам перадпенсійнага ўзросту.

■ Сацыяльны клопат

## ПАМЕНШЫЦЬ БОЛЬ

**Як дапамагчы дзецям, што невылечна хворыя**

**Падчас пасяджэння Нацыянальнай камісіі па правах дзяцей прадстаўнікі ўрада, выканаўчай і заканадаўчай улады, Міністэрства аховы здароўя абмеркавалі, на якім узроўні знаходзіцца дапамога дзецям з захворваннямі, якія немагчыма вылечыць (паліятыўная дапамога).**



Фота БЕЛТА.

Развіццё паліятыўнай дапамогі ў нашай краіне апошнім часам набыло асаблівую значнасць, — падчас наведвання Дома дзіцяці зазначыла **Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі.** — Больш чым 800 дзецям патрэбна такая дапамога. Многія з іх не маюць бацькоў, альбо тыя пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Сітуацыі бываюць розныя. У той жа час важна дапамагаць не толькі дзецям, але і іх родным.

**Святлана МАЛАШКА, галоўны ўрач мінскага Дома дзіцяці №1 для дзяцей з арганічным пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі,** расказала, што ўстанова спачатку была інтэрнатнага тыпу. Але ў 2002 годзе адкрыліся паліятыўныя палаты для дзяцей, якіх даглядаюць бацькі. Гэта тыя дзеці, якія маюць пасведчанне, што іх захворванне немагчыма вылечыць. «Мы даглядаем іх, аказваем сімптаматычнае лячэнне, бацькоў у наведваннях не абмяжоўваем. Такім чынам паляпшаем якасць жыцця дзетак і ўсёй сям'і. З бацькамі працуе псіхолаг, праводзіць заняткі, гутарыць для таго, каб захаваць сям'ю», — паведаміла яна. Ва ўстанове знаходзіцца 26 такіх асаблівых дзяцей, для якіх працуе 4 палаты паліятыўнай дапамогі.

**Па словах Дзмітрыя ПІНЕВІЧА, першага намесніка міністра аховы здароўя,** удасканаленне гэтай сферы — доля развітых краін. Пры гэтым цяпер мы можам казаць пра дапамогу не толькі напрыканцы жыцця, але і з нараджэння і далей. На думку першага намесніка міністра, кірункі вырашэння існуючых у сферы праблем — паляпшэнне заканадаўства, якасная перападрыхтоўка спецыялістаў, а таксама прыцягненне да сумеснай працы валанцёрскіх арганізацый і выкарыстанне замежнага вопыту.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## Партнёры з Вялікабрытаніі

**Якія кірункі ўзаемадзеяння з імі могуць быць перспектыўнымі для нас**

**Сфарміраваць групы дружбы ў парламентах нашай дзяржавы і Вялікабрытаніі прапануе старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. Пра гэта ён заявіў на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі Фіёнай Гіб.**

Паводле слоў старшыні Савета Рэспублікі, Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні эканамічнага супрацоўніцтва з Вялікабрытаніяй. Тавараабарот паміж краінамі даволі высокі. Калі прааналізаваць яго структуру, то беларускі экспарт у асноўным прадстаўлены прадуктамі перапрацоўкі нафты, калійнымі ўгнаеннямі. «Гэта добра, але хацелася б дыверсіфікаваць структуру, каб таварная наменклатура была крыху шырэйшая», — адзначыў ён.

Спікер верхняй палаты таксама адзначыў, што Беларусь, у прыватнасці, зацікаўлена ў развіцці супрацоўніцтва ў хімічнай прамысловасці. Што да вытворчасці лекаў, наша дзяржава па гэтым напрамку цяпер працуе ў тым ліку з Індыяй, было б перспектыўна наладзіць узаемадзеянне і з кампаніямі з Вялікабрытаніі, дадаў спікер. Старшыня Савета Рэспублікі лічыць,



Фота БЕЛТА.

што бакам неабходна абмеркаваць дагаворна-прававую базу, каб можна было развіваць супрацоўніцтва па асобных пытаннях эканамічнага, гуманітарнага, навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння.

**Раман АЛЯХНОВІЧ**

## Традыцыя выхаднога дня

Прамыя тэлефонныя лініі ў суботу, 17 снежня, зноў будуць арганізаваны па ўсёй краіне. На сувязі з насельніцтвам кіраўнікі рэгіёнаў, гарадскіх і раённых адміністрацый. Каб расказаць пра свае праблемы, жыхарам вёсак альбо далёкіх гарадоў не прыйдзецца ехаць у вобласць. Званкі будуць прымаць на месцах. Бо большасць спрэчных пытанняў можна вырашыць на пачатковым этапе. Першая палова выхаднога дня — з 9 раніцы і да поўдня — выбрана для зручнасці грамадзян, калі большасць з іх знаходзіцца дома і могуць спакойна датэлефанавацца і задаць свае пытанні прадстаўнікам улады.

**Прамыя тэлефонныя лініі ў гэтую суботу правядуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам:** Ліс Анатоль Васільевіч — старшыня (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:** Шарстнёў Мікалай Мікалаевіч — старшыня (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам:** Дворнік Уладзімір Андрэевіч — старшыня (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:** Шулейка Юрый Вітольдавіч — намеснік старшыні (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам:** Харытончык Дзмітрый Іванавіч — намеснік старшыні (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам:** Плаўскі Алег Альфрэдавіч — намеснік старшыні (5004160);

**Мінскі гарвыканкам:** Мацельская Ганна Мар'янаўна — кіраўнік спраў (2224444).

■ Блізкая ўлада

## НАЯЎНАСЦЬ МОГІЛАК ТРЭБА ДАКАЗАЦЬ

**Падчас прыёму грамадзян, які правёў старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА ў Маладзечне, традыцыйна сярод заяўнікаў знайшліся і тыя, хто прывык спадзявацца не на свае сілы, а перш за ўсё на дзяржаву. У прыватнасці, Святлана Уладзіміраўна сцвярджала, што яе дом непрыгодны для пражывання: затоплены вадой падвал, пастаянна вільготныя сцены. Жанчына прасіла пасадзейнічаць у правядзенні капітальнага рамонту адпаведнымі службамі.**

Старшыня Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр Яхнавец растлумачыў, што дом належыць прадпрыемству «Камунальнік». Пасля зваротаў жыльцоў гэта арганізацыя правяла бягучы рамонт: перакрыла дах і ўладкавала дзіцячую пляцоўку. «На наступны год абследуем сцены цеплавізарам і, калі становішча, пра якое паведамляе жанчына, пацвердзіцца, уключым дом у план капітальнага рамонту», — пракаментаваў званок Аляксандр Яхнавец. Аднак такі адказ не задаволіў жанчыну.

— У кожным раёне распрацаваны графікі чарговасці рамонту жылога фонду, уладкавання вуліц і дарог. Яны надрукаваны ў мясцовых газетах. Акрамя таго, створаны камісіі, якія вызначаюць стан аб'ектаў і вылучаюць тыя, якія ў першую чаргу патрабуюць рамонту. І я не маю права мяняць іх рашэнне. А калі ваш дом не трапіў у графік, то збірайцеся і зрабіце, як сапраўдныя гаспадары, усё неабходнае самі, — падтрымаў старшыню райвыканкама кіраўнік вобласці.

А вось задума прадпрымальніка Максіма Максіменкі губернатару спадабалася. Максім Уладзіміравіч хоча пабудаваць хлебазавод у мястэчку Радашковічы. Калісьці такое прадпрыемства паспяхова працавала. Цяпер, нягледзячы на тое, што ў мясцовых крамах дастатковы асартымент хлебабулачных вырабаў розных вытворцаў, мясцовыя жыхары сумуюць па тых «кірпічыках», якія выпускаў завод.

У свой час будынак былога хлебазавода набыў з аўкцыёна прыватнік. Затым завод неаднаразова перапрадаваўся. І вось нарэшце знайшоўся гаспадар, які хоча аднавіць развалины, наладзіць вытворчасць і стварыць каля 100 працоўных месцаў, што таксама немалаважна для пасёлка: многія жыхары ездзяць на работу ў Мінск.

Іншыя заяўнікі, Ігар Уладзіміравіч і яго жонка Алена Яўгенаўна, расказалі кіраўніку рэгіёна, што яны купілі ўчастак для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. Аднак пад слоем грунту знайшлі косці. Напачатку падумалі, што гэта астанкі жывёл. Але затым адкапалі чалавечы чэрап. Пра гэта паведамілі ў сельвыканкам, раённы аддзел унутраных спраў. Следчы камітэт па Маладзечанскім раёне правёў экспертызу рэштак. Да таго ж, фрагменты чалавечых шкілетаў знаходзілі і іншыя жыхары. Муж і жонка просяць кіраўніка цэнтральнага рэгіёна пасадзейнічаць ім у атрыманні новага зямельнага надзелу.

— Мы звярталіся ў пракуратуру, але там не маюць падстаў для рэагавання, паколькі не ўдалося знайсці дакументы, што тут калісьці былі могілкі. А значыць, мы не маем права на другі ўчастак. Узаконіць могілкі можа толькі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Ды для гэтага трэба папярэдне правесці раскопкі, якія пацягнуць на вялікую суму. Лішніх грошай у нас няма, — тлумачылі заяўнікі.

— Сапраўды, сітуацыя складаная, — пагадзіўся Сямён Шапіра. — Па закону вам нельга выдзеліць новы ўчастак. Аплаціць кошт работ з бюджэту мы таксама не маем права, паколькі зямля ў прыватнай уласнасці. Але мы можам звесці да мінімуму расходы. Пацяплее — выдзелім рабочых, тэхніку. Калі могілкі прызнаюць афіцыйна, вам дадуць у карыстанне іншы ўчастак.

Усяго старшыня аблвыканкама выслухаў 10 чалавек. Пытанні, якія не патрабуюць дадатковага вывучэння, былі вырашаны на месцы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by)*

## У ФАЗЕ ЎПЭЎНЕНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Эксперты ўпэўнены, што зараз мы маем справу не з ператокам грошай з рахунку на рахунак ці з валюты ў валюту, а з адтокам. Праўда, валюта, якая адбіраецца з банкаў, потым прадаецца на ўнутраным рынку, а атрыманыя рублі трапляюць у рэальны сектар эканомікі. Няўжо гэта для дзяржавы дрэнна? Пытанне не зусім простае. За студзень—кастрычнік беларусы на чыстай аснове прадалі 1,6 млрд долараў. У маштабах айчыннага рынку гэта вельмі шмат, і гэты фактар сёлета аказаў рублю вельмі добрую падтрымку, лічыць Жанна Кулакова.

### Усякі грош харош?

Велізарнае значэнне для валютнага рынку мае сальда знешняга гандлю — гэта значыць, розніца паміж імпартам і экспартам. Калі экспарт будзе перавышаць імпарт, то прадпрыемствы не будуць праяўляць празмерны попыт на валюту. У першым паўгоддзі сітуацыя ў знешнім гандлі была не самай спрыяльнай, сальда сыходзіла ў мінус на некалькі соцень мільёнаў долараў, але цяпер усё выправілася, і сальда ўжо 4 месяцы запар станоўчае. Больш таго — станоўчым з'яўляецца і выніковы паказчык па сальда з пачатку года. За студзень—верасень экспарт перавысіў імпарт на 390,5 млн долараў. У выніку прадпрыемствы і іншыя юрасобы не праяўляюць на валюту значнага попыту. За студзень—кастрычнік яны купілі на чыстай аснове ўсяго 8 млн долараў, а ў маштабах макраэканомікі гэта практычна нуль. Адзначаная тэндэнцыя ўзмацнілася яшчэ і тым фактам, што нерэзідэнты ў гэты перыяд выступілі чыстымі прадаўцамі і прадалі 374,9 млн долараў. Усяго з боку насельніцтва, прадпрыемстваў і нерэзідэнтаў мае чысты прыток валюты на айчынны рынак 2 млрд долараў. А гэта ўжо сапраўды вельмі шмат, лічыць эксперт. Рубель з такім прытокам мог значна ўмацавацца, але гэтага не адбылося: з пачатку года ён знізіўся да долара на 4,7%, да еўра ўпаў на 1,6%, да расійскага рубля — амаль на 20%. Гэта пры тым, што валюты на ўнутраным рынку было з лішкам, а цэны на нафту і расійскі рубель выглядаюць значна лепш, чым у пачатку года.

### Што вінен, аддаць павінен

Значную частку валюты, якую прадало насельніцтва і прадпрыемствы, купіў Нацбанк. Перад нашай краінай досыць востра стаіць праблема пагашэння валютнага дзярждоўгу. Сёлета агульная сума такіх плацяжоў перавышае 3 млрд долараў. Аб'ём золата-валютных рэзерваў (ЗВР) у Беларусі невялікі, таму валюта нам вельмі патрэбная.

У 2016 годзе дзяржаве ўдалося прыцягнуць 800 млн долараў за кошт крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця (ЕФСР), 1,3 млрд долараў за кошт валютных аблігацый на ўнутраным рынку, што ў суме дае ўжо больш за 2 млрд, астатняе далі экспартныя пошліны і купля валюты на ўнутраным рынку. У выніку краіна здолела абслужыць валютны дзярждоўг і нават нарасціць ЗВР. Калі б не актыўнасць насельніцтва, якое прадало звыш 1,6 млрд долараў, сітуацыя на валютным рынку была б значна больш напружанай.

### Загляне сонца і ў наша аконца

Наступны год для нашай фінансавай сістэмы абяцае стаць таксама складаным. Налета абслугоўванне валютнага дзярждоўгу запатрабуе адшукаць каля 2,3 млрд долараў. Сума вялікая, але гэта ўжо крыху менш, чым сёлета. Плануецца прыцягнуць 700 млн долараў за кошт крэдыту ЕФСР, 800 млн долараў за кошт размяшчэння еўрабондаў, а таксама 360 млн долараў за кошт продажу аблігацый на ўнутраным рынку. У суме атрымліваецца 1,86 млрд, а астатнія 450 млн долараў прынясуць краіне экспартныя пошліны і купля Нацбанкам валюты на ўнутраным рынку. Калі гэты план цалкам удасца ажыццявіць на практыцы, то рублю ў найбліжэйшы час нічога не пагражае, упэўнены фінансавыя эксперты. Праблемы на валютным рынку могуць пачацца ў выпадку, калі сальда знешняга гандлю стане адмоўным, ці калі дзяржаўным органам не ўдасца рэалізаваць усе запланаваныя запазычанні або калі адбудуцца нейкія знешнія шокі. Аднак у найбліжэйшы час бягучыя тэндэнцыі, хутчэй за ўсё, захаваюцца, упэўнена эксперт-аналітык, і рубель будзе адчуваць сябе нядрэнна.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*